**1 чэрвеня 2025 г. – 65 гадоў з дня ўтварэння Кобрынскага аддзела Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь (1960)**



У сістэме Міністэрства ўнутраных спраў БССР 29 кастрычніка 1952 года было створана спецыяльнае падраздзяленне пазаведамаснай аховы. Загадам ад 1 чэрвеня 1960 года № 151 УУС г. Брэста быў утвораны Кобрынскі аддзел пазаведамаснай аховы пры аддзеле ўнутраных спраў Кобрынскага гаррайвыканкама. Першым начальнікам аддзела стаў старшы лейтэнант міліцыі Аляксей Сямёнавіч Буневіч, які ўзначальваў яго да 1979 года. У той час у аддзяленні было шэсць атэставаных супрацоўнікаў і ахоўвалася вартаўнічым складам 20 аб'ектаў, як правіла, дзяржаўных прадпрыемстваў.

Ішлі гады, змяняліся назвы ўстановы, пакаленні, але нязменнымі заставаліся мэта і задачы – абарона і ахова любых форм уласнасці ад злачынных замахаў. Загадам аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 1991 года № 01 Кобрынскі аддзел пазаведамаснай аховы перайменаваны ў Кобрынскі аддзел аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь. У 2007 годзе ўведзены ў эксплуатацыю новы адміністрацыйны будынак аддзела, размешчаны па адрасе: г. Кобрын, вул. Першамайская, д. 100. У 2024 годзе загадам МУС Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага перайменаваны ў Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

Сёння Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь з'яўляецца мабільным, тэхнічна абсталяваным і ўзброеным падраздзяленнем. З кожным годам удасканальваюцца сродкі аховы. Колькасць ахоўных аб'ектаў расце, усё больш людзей звяртаюцца, каб засцерагчы сябе і сваю маёмасць, устанаўліваюцца новыя кантакты з зацікаўленымі ведамствамі і арганізацыямі. Штодня для аховы аб'ектаў і грамадскага парадку ў Кобрыне заступаюць нарады груп затрымання аддзела аховы, якія своечасова рэагуюць на спрацоўванне трывожнай сігналізацыі. Акрамя забеспячэння аховы аб'ектаў, работнікі аддзела выконваюць задачы па прадухіленні і спыненні злачынстваў і парушэнняў

грамадскага парадку. Вялікую дапамогу аказваюць іх чацвераногія сябры – службовыя сабакі, якія разам з кіналагічнай службай выязджаюць на месцы здарэння і аказваюць дапамогу ў затрыманні злачынцаў.

Шматлікія ўзнагароды, атрыманыя аддзелам і персанальна яго супрацоўнікамі, сведчаць аб тым, што ў сваёй рабоце Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы накіраваны на вынік. Так, у 2017 годзе ў абласным аглядзе-конкурсе сярод падраздзяленняў Дэпартамента аховы Брэсцкай вобласці аддзел заняў III месца ў намінацыі «Лепшая спартыўная база», у 2018 годзе – I месца ў намінацыі «Лепшы клас па службовай падрыхтоўцы» і III месца ў рэспубліканскім конкурсе ў гэтай жа намінацыі. Па выніках службовай дзейнасці ў 2019 годзе аддзел заняў I месца сярод падраздзяленняў Брэсцкай вобласці. У 2021 годзе ў рэспубліканскім аглядзе-конкурсе сярод падраздзяленняў Дэпартамента аховы аддзел заняў II месца ў намінацыі «Лепшая спартыўная база». Па выніках службовай дзейнасці ў 2022 годзе Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы прызнаны лепшым падраздзяленнем у Рэспубліцы Беларусь. Пост па ахове ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод» неаднойчы займаў першыя месцы па выніках рэспубліканскага агляду-конкурсу «Лепшы вартаўнічы пост».

Гісторыя службы - гэта слаўны шлях, поўны гераічных будняў і самаахвярнага служэння народу. Многія супрацоўнікі, а цяпер ветэраны аддзела, прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сярод ветэранаў аддзела ёсць тыя, хто выконваў воінскі абавязак у Рэспубліцы Афганістан.

У розны час аддзел узначальвалі: капітан міліцыі У. М. Герасімовіч (1979-1983), маёр міліцыі І. В. Гарбацэвіч (1983-1986), падпалкоўнік міліцыі В. А. Азарка (1986-1991), падпалкоўнік міліцыі М. А. Давыдчык (1991-1999), падпалкоўнік міліцыі Г. П. Ператолчын (1999-2003), падпалкоўнік міліцыі А. А. Старавойтаў (2003), палкоўнік міліцыі М. М. Юркевіч (2003-2005), палкоўнік міліцыі С. А. Цялегін (2005-2006), падпалкоўнік міліцыі І. І. Хвірысюк (2006-2014), падпалкоўнік міліцыі А. С. Казюк (2015-2017), падпалкоўнік міліцыі У. А. Калядзіч (2017-2021), маёр міліцыі М. А. Дацык (2021-2024). З 2024 года начальнікам Кобрынскага аддзела Дэпартамента аховы МУС з’яўляецца падпалкоўнік міліцыі Віталій Мікалаевіч Кухарчук.

Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы МУС на сучасным этапе застаецца мабільным міліцэйскім падраздзяленнем, які здольны забяспечваць надзейную ахову маёмасці розных форм уласнасці.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Кобрынскаму** аддзелу Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь (1960) – 65 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 188.

**Андросова, О.** Департамент охраны отпраздновал юбилей / Ольга Андросова ; фото Ирины Омельянчук // Кобрынскі веснік. – 2025. – 7 чэрвеня (№ 23). – С. 4 : фот.

**Андросова, О.** Безопасность. Надежность. Профессионализм / Ольга Андросова ; фото: Павел Дмитриев // Кобрынскі веснік. - 2024. — 26 кастрычніка (№ 43). — С. 7 : фот.

Начальник Кобринского отдела Департамента охраны МВД подполковник Виталий Кухарчук рассказал об особенностях работы отдела.

**Елизарова, Ж.** Работают, чтобы мы жили спокойно / Жанна Елизарова ; фото из архива Кобринского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь // Кобрынскі веснік. - 2023. — 28 кастрычніка (№ 65). — С. 5 : фот.

О работе Кобринского отдела Департамента охраны МВД рассказал майор милиции Максим Дацик.

**Савчук, М.** Максим Дацик — новый руководитель Кобринского отдела охраны / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 30 декабря (№ 52). — С. 6 : фот.

**Савчук, М.** Отдел охраны принимал поздравления / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2021. — 11 марта (№ 10). — С. 6 : фот.

Состоялось чествование работников Кобринского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь.

**Савчук, М.** 60 лет на страже. Кобринский отдел охраны отметил юбилей / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 4 июня (№ 23). — С. 4 : фот.

Кобринский отдел Департамента охраны МВД Республики Беларусь отметил 60-летний юбилей.

**Ализар, К.** Бережет покой охрана / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 26 кастрычніка. — С. 3 : фот.

В штате Кобринского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь работают около 200 человек.

**Колядич, У. А**. "Профессионализм, надежность, безопасность в основе деятельности Департамента охраны" / Ульян Колядич ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 6 июня (№ 23). — С. 6.

Беседа с начальником Кобринского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь У. Колядичем.

**Никто** не забыт // Кобрин-информ. - 2019. — 2 мая (№ 18). — С. 4.

Состоялось собрание руководства и ветеранов Кобринского отдела охраны.

**Ветеранской** организации присвоено имя М. А. Давыдчика // Кобрин-информ. - 2018. — 15 ноября (№ 46). — С. 6.

Ветеранская организация Кобринского отдела охраны удостоилась чести носить почетное звание имени полковника милиции М. А. Давыдчика.

**Колядич, У**. Сила слова / Ульян Колядич // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 лістапада. — С. 7.

Милиционер взвода милиции Кобринского отдела Департамента охраны МВД РБ А. Кулич успешно принял участие в конкурсе ораторского мастерства среди подразделений департамента.

**Дорогокупец, А.** Охрана сработала на "отлично" / Андрей Дорогокупец // Кобрынскі веснік. - 2017. — 18 лютага. — С. 3.

Почетное звание "Лучшее строевое подразделение милиции в 2016 году" присвоено Кобринскому отделу Департамента охраны МВД Республики Беларусь.

**Савчук, М**. Ветераны охраны — хранители славных традиций / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 16 ноября. — С. 6.

О работе ветеранской организации Кобринского отдела Департамента охраны.

**Козюк, А.** «Ничего нет надежней охраны» / Александр Козюк; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2015. – 29 октября. – С. 6.

Интервью с начальником Кобринского отдела охраны.

**Дубіна, Л.** Афіцэр - гэта лад жыцця / Людміла Дубіна ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. — 12 лістапада. — С. 2.

Аб Іване Хвірысюке, які ў 2006 г. узначаліў аддзел Дэпартамента аховы МУС.

**Хвірысюк, І.** Службе аховы - 61 год! / Іван Хвірысюк // Кобрынскі веснік. - 2013. — 2 лістапада. — С. 3.

Напярэдадні прафесійнага свята - аб Кобрынскім аддзеле Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь.

**Бялоў, Д.** Гатовыя прыйсці на дапамогу / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 31 кастрычніка. - С. 2.

**Пашкович, Л.** Под защитой Департамента охраны / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 2 лістапада. - С. 3.

**Савчук, М.** Мы - служба охраны / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2011. - 27 октября. - С. 4.

О работе Кобринского отдела охраны.

**Бялоў, Д.** Паўстагоддзя - на службе аховы / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 9 чэрвеня. - С. 3.

Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь адзначыў 50-годдзе.

**Дорогокупец, А**. На страже порядка - отдел охраны / А. Ф. Дорогокупец // Кобрин-информ. - 2010. - 28 октября. - С. 4.

**Хвирисюк, И. И**. По сигналу "Тревога" : [Кобринский отдел охраны] / И. И. Хвирисюк // Кобрин-информ. - 2010. – 4 марта. - С. 4.

**Савчук, М.** Новоселье в Кобринском отделе охраны / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2007. - 25 октября. - С. 4.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы

***Прадметы:***

Міліцыя